*У артыкуле разглядаецца структура ўпарадкавання часу ў веснавым сегменце беларускага традыцыйнага календара, даецца аналіз часавай суаднесенасці рухомых і нерухомых святаў, звязаных з хрысціянскай Пасхаліяй. Зроблены вывад пра тое, што дзве традыцыі (царкоўная і народная) не толькі ўзаемаўплывалі і ўзаемаўзбагачалі адна адну, але і ў пэўнай ступені парушылі адвечную прыродна-касмічную прымеркаванасць архаічнага славянскага календара.*



# ХРЫСЦІЯНСКАЯ ПАСХАЛІЯ: ШМАТВЯКОВАЯ ПОВЯЗЬ ЧАСУ

## Сінтэз народнай і хрысціянскай традыцый ў структуры беларускага народнага календара



**А. В. Катовіч,**
старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ,
аспірант Інстытута мастацтвазнаўства і фальклору НАН Беларусі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Прыняцце ўсходнеславянскімі народамі хрысціянскай рэлігійнай традыцыі з цягам часу прывяло да шматлікіх і даволі значных змен у духоўным жыцці беларускага этнасу. Па-першае, хрысціянства прынесла з сабой прынцыпова іншую светапоглядную сістэму, сістэму сацыяльных і культурных каштоўнасцей, зусім іншую версію аб паходжанні свету і тых сілах, якія ўтрымлівалі гармонію суіснавання чалавека і соцыуму, чалавека і прыроды, космасу. Па-другое, прыхільнікі вучэння Хрыста прынцыпова адмаўлялі магчымасць бытавання традыцый, якія тысячагоддзямі існавалі на гэтай зямлі, дапамагаючы чалавеку праз сакральна-магічны дыялог далучыцца да інфармацыйна-энергетычнага поля Зямлі і тым самым павялічваць яго кансалідаваны патэнцыял, адначасова выкарыстоўваючы для паўнавартаснага жыцця і рознабаковай дзейнасці на роднай зямлі. Па-трэцяе, хрысціянства прынесла з сабой іншае разуменне часу, а таксама своеасаблівую сістэму яго ўпарадкавання і асэнсавання. Можна без перабольшання сказаць, што змены закранулі фундаментальныя асновы ў асэнсаванні часу як найважнейшай светапогляднай катэгорыі.

Вядома, што ў дахрысціянскую эпоху ўсходнія славяне (як і большасць еўрапейскіх народаў) пунктам злічэння існавання чалавецтва лічылі той міфалагічны час, калі быў створаны свет – «**эру ад стварэння свету**». «Такую эру прынята было называць сусветнай, таму што яна выкарыстоўвалася ў многіх краінах. Аднак год гэтай падзеі вызначалі па-рознаму. У гісторыі налічваецца каля 200 розных эр ад стварэння свету. Назавём некаторыя з іх: анціохская эра адносіць стварэнне свету да 1 верасня 5969 года да н. э. (па іншых крыніцах 5515 або 5507 да н. э.), александрыйская эра – 29 жніўня 5493 года да н. э., візантыйская эра – 1 верасня 5509 да н. э. або 1 сакавіка 5508 да н. э. Апошнюю эру таксама называюць канстанцінопальскай або старажытнарускай, таму што яе выкарыстоўвалі для злічэння гадоў на Русі» [5, с. 57]. Кожны пражыты год успрымаўся нашымі продкамі новым (чарговым) і цалкам паўтораным актам першатварэння. Уяўленні аб часе абапіраліся на універсальны міф аб паміраючым і ўваскрасаючым дрэве. Ва ўсе часы дрэва сімвалізавала дынамічны рост, сезоннае паміранне і наступную за смерцю рэгенерацыю. Увосень (пару сталасці і старасці) яно скідвала лістоту, пераўвасаблялася, памірала на перыяд працяглага зімовага спачыну, а вясной зноў ажывала, нараджалася, вяртаючы сабе колішнюю прыгажосць. Улетку дрэва дасягала найвышэйшага росквіту, а затым зноў скідвала лістоту, каб памерці. Таму каляндарны год успрымаўся не толькі завершаным прыродна-касмічным цыклам, але і чарговым этапам жыццёвай закальцаванасці. Квінтэсенцыяй разумення прыродна-касмічных цыклаў, зафіксаваных ў старажытным міфе, стала шырока вядомая формула «ўсё вяртаецца на кругі свае».

Хрысціянская культура прынесла і замацавала ў свядомасці людзей новы пункт вылічэння часу – «**ад Ражства Хрыстова**». З цягам часу была вызначана і дата распачынання «новага» вылічэння часу – 25 снежня. Справа ў тым, што практычна ва ўсіх традыцыйных культурах свету самае галоўнае месца адводзілася культу Сонца (Мітры). Вызначальнай кропкай адліку прыроднага і зямнога часу было зімовае сонцастаянне. У ноч з 24 на 25 снежня ў Паўночным паўшар'і адбываецца галоўная прыродна-касмічная падзея: самы кароткі па часе дзень «перанараджаецца» і пачынае «расці». «У 274 г. н. э. імператар Аўрэліан, жадаючы аб'яднаць

Рымскую імперыю вакол культа «Неперамožнага Сонца», вызначыў 25 снежня як дзень нараджэння Сонца. Больш чым праз 60 год пасля гэтага хрысціянская царква запазычыла гэту дату, каб святкаваць дзень нараджэння Ісуса Хрыста як новага Князя Свету. Снежаньскае сонцастаянне лічылася таксама днём нараджэння і іншых багоў, якія сімвалічна паміралі і перанараджаліся» [7, с. 170]. Даследчык праваслаўнай духоўнай традыцыі В. Калеснікава таксама дала трапную ацэнку значнаму гісторыка-культурнаму напластаванню: «Як і ўсё язычніцтва, пакланенне Мітры было абагаўленнем прыроды, прыродных жываносных сіл, а сонца – крыніцу жыцця – язычнікі ўшаноўвалі як найвышэйшую боскую сілу. Святам рэлігіі Сонца былі апошнія дні снежня – зімовага сонцастаяння, калі пачынаецца набліжэнне Зямлі да Сонца, становіцца больш цяпла і святла, набліжаецца веснавое ўваскрэсенне прыроды пасля зімовага памірання. Гэта свята ўспрымалася язычнікамі як перамога святла над цемрай, як адраджэнне ўсёй зямлі – боскае дзіва… У дзень зімовага сонцастаяння хрысціяне пачалі святкаваць Раство Ісуса Хрыста – як раство сапраўднага сонца…» [4, с. 332–333].

Прыхільнікі хрысціянства «разарвалі» закальцаваны дабіблейскі міфалагічны час у яго касмапланетарным разуменні і надалі яму выразна акрэсленую вектарную накіраванасць, арыентаваную на бясконца аддаленую будучыню. Хрысціянізаванае ў сваёй аснове вылічэнне часу працягваецца і сёння ў грамадскім, дзяржаўным і асабістым жыцці: гады мы лічым ад нараджэння Хрыстова. Між тым Праваслаўная Царква, распаўсюджваючы Хрысціянства на землях, дзе спрадвеку пражывалі ўсходнія славяне, паралельна карысталася вылічэннем гадоў ад утварэння свету амаль да сярэдзіны XVIII стагоддзя.

У старажытнай традыцыі кожны наступны год быў і старым і новым. Новым – у тым сэнсе, што ён распачынаў новы цыкл сельскагаспадарчых і земляробчых работ. Старым – таму што гэты цыкл ужо даўным-даўно быў замацаваны ў жыццёвым вопыце папярэднікаў і неаднаразова паўтараўся пры жыцці працаздольнага пакалення. Натуральна, што кожны новы год і кожнае новае пакаленне людзей сутыкалася з новымі, часам нечаканымі і непрадбачанымі падзеямі, з'явамі, сітуацыямі і, вырашаючы іх, знаходзіла аптымальнае рашэнне. Аднак найпершай іх задачай было надзейнае замацаванне традыцыі з дапамогай дакладнай фіксацыі зместу і фармальных рамак абраду, яго сюжэтнай, сакральнай па характары стаўлення, канвы.

У хрысціянскай мадэлі ўспрымання і асэнсавання часу гэты асноватворны прынцып быў захаваны. З кожным новым годам момант нараджэння Ісуса Хрыста як свяшчэнны акт першатварэння аддаляўся ў глыбіні гісторыі, але пры гэтым ён штогод успрымаўся як падзея, якая толькі што адбылася. Час, які, здавалася б, даўно адышоў у нябыт, захоўваў сваю надзённасць і актуальнасць дзякуючы таму, што ён быццам згортваўся ў клубок або світак, які і праз шмат стагоддзяў пасля ўзнікнення хрысціянства штогод разгортваўся ў структуры царкоўнага календара. У адпаведнасці з задумай багасловаў усё зямное жыццё Багародзіцы і яе незвычайнага Сына-богачалавека як бы адраджалася-ўзнаўлялася і цалкам паўтаралася на працягу кожнага наступнага года. Усе найважнейшыя падзеі жыцця склалі ядро хрысціянскага светапогляду і адначасова аснову царкоўнага календара.

Яшчэ адной прынцыповай асаблівасцю хрысціянскага ўспрымання часу стаў Пасхальны цыкл, які ахопліваў дваццаць тыдняў. Гэты абрадава-сакралізаваны прамежак часу сканцэнтраваў у сабе галоўныя падзеі, якія тычацца апошніх дзён зямнога жыцця Ісуса Хрыста, яго смерці, уваскрашэння і ўзнясення. Хрыстос пераадолеў межы зямнога існавання. Гэта асноваўтваральная ідэя была перанесена і на структуру Пасхаліі. У яе паступальным руху з'яўляецца даволі працяглы па часе перыяд, які папярэднічае самому святу (10 тыдняў) і ў роўнай ступені доўжыцца пасля яго. Гэты перыяд нібы «разрывае» храналагічную паслядоўнасць хрысціянскай светабудовы. Пасхальны цыкл стаў выключэннем з жыццёвых правіл і фактычна атрымаў статус свяшчэннага часу, які ўзнёсся не толькі над звыклай, прафаннай штодзённасцю, але і над сакральным часам святочнай рэчаіснасці. Кажучы інакш, жыццё Хрыста аб'яднала ў сабе два разуменні часу, дзве парадыгмы яго асэнсавання. Узнясенне на нябёсы – гэта і ёсць узнясенне над часам, якім вымяраецца жыццё на зямлі.

Доўгі час хрысціянскія багасловы шукалі адказ на пытанне: калі святкаваць Пасху Хрыста. Складаную філасофскую праблему ўдалося вырашыць толькі на Нікейскім Усяленскім Саборы ў 325 г.: **хрысціянская Пасха святкуецца ў першую нядзелю пасля першай поўні (фаза Месяца), якая надыходзіць пасля дня веснавога раўнадзенства (21 сакавіка). Да таго ж адзначаць хрысціянскую Пасху трэба толькі пасля святкавання іудзейскай Пасхі.**

Так у календары адбылася чарговая рэформа: у юліянскую сістэму парадкавання часу, з'арыентаваную на рух Сонца па небасхіле (зімовае і летняя сонцастаянне, веснавое і восеньскае раўнадзенствы), быў дапасаваны яшчэ адзін астранамічны складнік – рытмічнае чаргаванне фаз Месяца (межы, маладзік, поўня, збыт).

Каб вызначыць адзіныя правілы вылічэння даты хрысціянскай Пасхі, вядомы грэчаскі астраном Метон распрацаваў так званы **Александрыйскі пасхальны месяцавы цыкл**, які аб'яднаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

месяцавы цыкл (29,53 сутак) і сонечны год (365,25 сутак). Паводле гэтага цыкла фаза месяца (першы дзень першай фазы) супадае з каляндарным днём года (напрыклад, першым днём года) кожныя 19 год. Напрыклад, калі ў год Нікейскага Сабора маладзік прыпадаў на 1 сакавіка 325 года па Н.Х., то праз 19 год маладзік зноў будзе прыпадаць на 1 сакавіка, але ўжо 344 года па Н.Х.

Александрыйскае пасхальнае месяцавае кола (**Вялікі індыктыён**), у сваю чаргу, мае перыядычнасць у 532 гады. Кожны год Пасха святкуецца ў розныя дні, але праз 532 года ўсё паўторыцца зноў у той самай паслядоўнасці: праз 532 гады сонечнае (28 год) і месяцавае (19 год) колы сустрэнуцца. Апошняя такая «сустрэча» адбылася ў 1941 годзе.

Хрысціянская Пасха можа выпадаць на адзін з трыццаці пяці дзён паміж 22 сакавіка і 25 красавіка па юліянскім стылі (дзень святкавання Праваслаўнай Пасхі па грыгарыянскім стылі вызначаецца з 4 красавіка па 8 мая).

Прыняцце хрысціянства і асабліва ўкараненне Пасхаліі ў жыццядзейнасць вясковага соцыуму прывяло да падзелу некалі цэласнай, вякамі адладжанай, гарманічна ўпарадкаванай сістэмы святаў народнага календара беларусаў на два, хаця і ўзаемаспалучаныя, але ўсё ж у значнай ступені самастойныя цыклы святаў. Адзін з іх умоўна можна было б назваць цыклам «рухомых» святаў, які мае дакладна вызначаныя ўнутраныя ўзаемасувязі, а ў цэлым суадносіцца з днём святкавання Пасхі як зыходнай кропкай парадкавання часу ў гэтым сегменце календара. У склад рухомых святаў уваходзяць Масленіца, Вербніца, Чысты чацвер, Раданіца, Ушэсце, Тройца і інш. Кожнае з іх мае сваю сузалежнасць: штогод змяняючы даты, яны захоўваюць сваю алгарытмічную суаднесенасць. Прычым важна адзначыць тое, што перадвелікодны і паслявелікодны падцыклы ўтвараюць малюнак люстэркавай перавернутасці. Так, напрыклад, святкаванне Масленіцы заўсёды заканчваецца за сем тыдняў да Вялікадня, а святкаванне Тройцы, або Сёмухі пачынаецца праз сем тыдняў пасля яго. Вербніца адзначаецца за сем дзён да Вялікадня і, натуральна, просіцца лагічны працяг размясціць святы паслявелікоднага падцыкла ў адпаведнасці з перыядычнасцю, кратнай той самай сямёрцы. Аднак структураванне святаў гэтага сегмента адбывалася ў адпаведнасці з універсальным рытмам яшчэ дахрысціянскіх культур, які мы добра памятаем па разгортванні вектару пахавальна-памінальных абрадаў: 0 – 3 – 9 – 40 – 1 год. Таму найбольш шырока ў народным асяроддзі Пасха адзначаецца 3 дні, а далей не на сёмы, як вымагаў бы перадвелікодны падцыкл, а на 9-ы дзень (як патрабуе універсальны рытм) адзначаецца Раданіца – свята агульнародавай памяці. На 40-ы дзень святкуецца Узнясенне Хрыста, або Ушэсце (да якога на Гомельшчыне прымеркавана правядзенне свята «Ваджэнне і пахаванне Стралы»).

Разам з тым у гэтым працяглым па часе сегменце календара існуе цэлы шэраг святаў, якія не падпарадкоўваюцца Пасхаліі і заўсёды прытрымліваюцца адной і той жа даты. Да «нерухомых» адносяцца Саракі (22 сакавіка), Благавешчанне (7 красавіка), Юр'я (6 мая), Мікола Веснавы (22 мая) і інш. Прычым і адзін, і другі цыклы даволі істотна папоўніліся ўласна хрысціянскімі святамі, асобнымі элементамі, атрыбутамі, якія за час шматвяковага суіснавання былі ў значнай ступені пераасэнсаваны масавай свядомасцю і прыведзены ў адпаведнасць з традыцыйнымі светапогляднымі ўяўленнямі беларусаў. Напрыклад, галінкі асвечанай на Вербніцу вярбы шырока выкарыстоўваліся ў побыце, абрадавай практыцы і народнай медыцыне беларусаў. Галінкамі вярбы гаспадыня выганяла хатнюю жывёлу на першую расу на Юр'я. Акрамя таго, пупышкамі, сабранымі з трох асвечаных галінак вярбы, лячылі бяздзетнасць і празмерную прывязанасць чалавека да гарэлкі. Як бачым, атрыбутыка царкоўнага свята аказалася ўжыўленай у шматлікія кантэксты сялянскага побыту. Аднак вядома і супрацьлеглая накіраванасць узаемаўзбагачэння. Так, у дзень царкоўнага свята Узнясення жыхары Гомельшчыны выпякалі бліны з мукі розных зерневых культур і называлі іх (гэтыя бліны) «анучы Хрысту»: маўляў, калі ён будзе ўздымацца па лесвіцы на нябёсы, каб нагам было мякчэй.

Такім чынам, найважнейшае свята веснавога цыкла – Пасха – быццам бы ўзнеслася над будзённасцю і рэальнасцю зямнога існавання і стала вызначальнай кропкай злічэння для шэрагу святочных падзей, якія фактычна ахапілі ўвесь веснавы перыяд.

У адпаведнасці з рашэннем таго ж Нікейскага Сабору часавыя межы праваслаўнай Пасхаліі выглядаюць наступным чынам. Напярэдадні Пасхі асабліва ўшаноўваецца 70-дзённы падрыхтоўчы перыяд. Услед за Вялікаднём асаблівай павагай пазначаны 70-дзённы перыяд, прысвечаны паслясмяротным падзеям у жыцці Збавіцеля. Структура святаў Пасхаліі прыведзена на сайце (www.n-asveta.com/dadatki/katovich.pdf).

У свядомасці старажытнага славяніна кожнае наступнае свята было лагічным працягам папярэдняга. Тым самым утваралася гарманічнае суладдзе прыроды, чалавека і часу, якое ніколі не парывалася і не збівалася з заведзенага вякамі рытму. У свядомасці хрысціяніна Пасха ўспрымалася феноменам-выключэннем, святам, якое адначасова стаяла ў шэрагу іншых (таму што тыя былі шмат у чым залежныя ад яго) і разам з тым было па-за межамі ўсіх астатніх, яно стала не проста галоўнай урачыстасцю ў шэрагу іншых, а святам над святамі.





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасхальны тыдзень вылучаўся сярод астатніх цэлым шэрагам акалічнасцей. Па-першае, ён станавіўся яшчэ адным сакральным актам першастварэння, з яго пачыналася новае злічэнне часу, аб чым яскрава сведчаць варыянты валачобных песень:

*Паджыдае ён (гаспадар) светлых святачкаў,*
*Светлых святачкаў-велікоднічкаў.*
*Першага свята – святога Вялічка,*
*Другога свята – святога Юр'я,*
*Трэцяга свята – святога Міколу...*

Па-другое, Пасха ўводзіла новую, а можа, добра забытую сістэму вызначэння межаў тыдня: калі ў звычайнай сітуацыі **тыдзень распачынаўся панядзелкам**, то ў гэтым выпадку пунктам злічэння свяшчэннага часу станавілася **нядзеля**, г. зн. сама Пасха.

Калі ў перадвелікодныя сем тыдняў спіраль абрадавага часу быццам бы сціскалася пад уплывам падзей, звязаных з апошнімі тыднямі зямнога жыцця Хрыста, то пасля велікоднага тыдня тая ж спіраль пачынае раскручвацца ў процілеглым напрамку, захоўваючы пры гэтым сямідзённы рытм. Аднак, пачынаючы са Светлага Хрыстова Уваскрашэння, сем разоў **тыдзень будзе пачынацца ў нядзелю, а заканчвацца ў суботу**. І вось наступае сёмы тыдзень, які будзе «асвечаны» святам у гонар свяшчэннай Тройцы: Бога Айца, Сына Божага і Святога Духа. Цікава, але гэты тыдзень па царкоўным календары налічвае не сем, цэлых восем дзён – пачынаецца ў нядзелю і заканчваецца ў нядзелю пяцідзесятым днём (ад Вялікадня да Тройцы). Таму свята Тройцы таксама называюць днём святой Пяцідзесятніцы. На гэтыя няпростыя сем тыдняў пасля Вялікадня час быццам бы прыпыніцца, каб асэнсаваць усё тое, што адбылося – смерць Хрыста, Яго Уваскрашэнне, Сашэсце Святога Духа, каб пачаць зусім іншы адлік часу Новага Запавету.

Згодна царкоўнаму календару святкаванне пасхальнага цыкла заканчваецца ў панядзелак – дзень святкавання Сашэсця Святога Духа. У той жа час народны каляндар працягвае святочнае вылічэнне часу, святкуючы дзевяты і дзесяты тыдзень пасля Вялікадня. На тэрыторыі Усходняга і Заходняга Палесся важнае месца належыць такім святочным дням, як Градавая серада і Сухі чацвер, падчас якіх неабходна было прытрымлівацца шэрагу абмежаванняў, каб не наклікаць на вёску перуновы бліскавіцы і град. Такім чынам, народны каляндар як бы ўраўнаважыў два дзесяцітыднёвыя або сямідзесяцідзённыя прамежкі часу, якія прысвячаліся Вялікадню.

Разам з тым неабходна адзначыць, што ўвядзенне Пасхаліі ў значнай ступені паўплывала на касмічную і прыродную сузалежнасць традыцыйных рытуальна-абрадавых комплексаў, перш за ўсё Масленіцы і Зялёных святаў, якія дакладна маркіравалі пераход зімы ў вясну і вясны ў лета. З увядзеннем матрыцы хрысціянскай Пасхаліі час іх святкавання стаў рухомым, чым парушылася іх адвечная прыродная аснова. Яшчэ больш прынцыповыя неадпаведнасці тычацца святкавання Раданіцы, якая некалі была сімвалічнай мяжой для пачатку цыкла земляробчых работ. У народзе казалі: «Не чапай зямлю да Раданіцы і пасля Пакроваў, можа быць смерць у тваёй сям'і». Славянская традыцыйная свядомасць грунтавалася на наступным прынцыпе: «перш чым наводзіць парадак на сваім прысядзібным участку, схадзі і навядзі парадак на магілах сваіх продкаў». Зразумела, што пасля таго, як Раданіца аказалася ў структурнай падпарадкаванасці хрысціянскай Пасхаліі, тэрмін яе правядзення мог адсоўвацца аж да сярэдзіны мая. Але ж да гэтага часу большасць пасяўных работ ужо будзе завершана. Народная свядомасць знайшла выйсце з гэтай неадпаведнасці зусім іншай часавай «прывязкай» узгаданай вышэй рэгламентацыі, далучыўшы яе да Благавешчання.

Такім чынам, вясновы сегмент славянскага, у тым ліку і беларускага традыцыйнага календара, стаў своеасаблівай эксперыментальнай пляцоўкай, у межах якой на працягу шэрагу стагоддзяў адбываўся складаны і часам супярэчлівы працэс узаемапранікнення і ўзаемаабагачэння народнай і хрысціянскай традыцый. Вынікам таго эксперыменту стаў своеасаблівы сінтэз гэтых традыцый, які атрымаў назву «народнае хрысціянства» і да гэтага часу шмат у чым вызначае спецыфіку нашага менталітэту і этнічнай талерантнасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Агапкина, Т. А.** Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М.: Индрик, 2002.
2. **Арх. Никифор.** Иллюстрированная полная популярная библейская энциклопедия. – М., 1891.
3. **Жыцця адвечны лад:** беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1998.
4. **Краткая энциклопедия православия.** Путь к храму. – М.: Центрополиграф, 2003.
5. **Петрова, Н. Г.** Тайны древних календарей / Н.Г. Петрова. – М.: Вече, 2003.
6. **Петрухин, В. Я.** Крещение Руси: от язычества к христианству / В. Я. Петрухин. – М.: АСТ: Астрель, 2006.
7. **Полная энциклопедия символов** / сост. В. М. Рошаль. – М.: Эксмо; СПб.: Сова, 2003.
8. **Славянские древности:** этнолингв. слов.: в 5 т. / рэдкал.: Т. А. Агапкина [и др.]. – М.: Междун. отношения, 1995–2008. – Т. 3. – 2004. – 698 с.


РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ